# ЧАРНОБЫЛЬ: АСЭНСАВАННЕ ПРАЗ ГАДЫ

**Ю.Я. Сальнікава**

Пачынаючы з другой паловы мінулага дзесяцігоддзя, тэма Чарнобыля трывала ўвайшла ў беларускую літаратуру.Бадай, ніводзін айчынны пісьменнік не абыходзіць у сваёй творчасці апісання і асэнсавання наступстваў гэтай жудаснай аварыі, што забрудзіла не толькі прастору Беларусі, але і яе час. Для многіх творцаў чарнобыльская тэматыка з'яўляецца выпрабаваннем сапраўднасці і мужнасці іх таленту, бо вымагае не толькі надзвычайнага напружання духоўных і маральных сіл, але і праяўлення цвёрдай грамадзянскай пазіцыі. На працягу злавесных 13-ці год радыяцыйная навала ўспрымалася ў асноўным адназначна – як неперадольная трагедыя краіны і народа, як чарговае выпрабаванне талерантнасці беларусаў, як доказ чорнай планіды шматпакутнай нацыі.

Але літаратура апошняга часу сведчыць, што чорныя крылы Чарнобыля "пасвятлелі" ў параўнанні з тымі прынцыпамі і законамі, па якіх зараз жыве (існуе?) Беларусь. Пры гэтым экзістэнцыйнае значэнне красавіцкай катастрофы аніякім чынам не аспрэчваецца, хаця і губляе сваю першаступенную важнасць. Асабліва яскрава дадзеная выснова прасочваецца ў творах нашых слынных празаікаў. Так, аповесць В.Быкава "Ваўчыная яма" ("Полымя".1999.№1) і раман Ю.Станкевіча "Любіць ноч – права пацукоў" ("Крыніца".1998.№9) амаль цалкам нейтралізуюць трагедыйнасць Чарнобыля, дэкларуючы яго станоўчую, нават выратавальную ролю ў сённяшніх умовах.

Збаўцай выступае чарнобыльская зона для герояў В.Быкава, якіх грамадства выштурхнула са сваёй тэрыторыі за непадпарадкаванне агульнапрынятым законам. Салдат-дэзерцір і бомж, здаецца, міжволі апынуліся ў атамным пекле, каб зразумець, што не яны трапілі ў ваўчыную яму, з якой "як ні скачы – не выскачыш"[1]. Усё астатняе чалавецтва з веку ў век гібее ў сваім уяўным камфорце – сапраўднай звярынай яме, - што паралізуе волю і свядомасць асобы, прымушаючы забыцца на гэтыя адзіныя абсалютныя чалавечыя якасці. Вызваліўшыся з-пад улады варожага соцыуму, героі перастаюць адчуваць перманентнае становішча чужаніцы, што неадступна пераследавала іх на працягу ўсяго існавання. У зоне абсалютная адзінота перамагла экзістэнцыйную, што надало сэнс учынкам, хаця і не выратавала ад заканамернай пакутлівай смерці: "...Сапраўды, ніхто яго тут (у зоне) не падаахвочваў, не тузаў і не забараняў, тут ён круглы дзень пачуваўся



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*свабодным*, залежным толькі ад уласнае волі…Здаецца, ужо тут яна (свабода) стала абсалютнай, і ён акрыяў" [2].

Тэму сэнсастраты чалавечага жыцця і смерці ўздымае ў сваім рамане і Ю.Станкевіч, праз экзістэнцыйнае мысленне якога пераадольваецца незразумеласць абсурду, калі Чарнобыль выступае фактарам, які дапамагае выжываць беларускай нацыі. Гэта дасягаецца за кошт надання іншай чорнай сіле фатальнай магутнасці.

Іллжэбежанцы, якія насамрэч ёсць канцэнтрацыя ўсіх заганаў і бруду свету, прусакамі спаўзаюцца на землі даўно ўжо не Белай Русі і асімілююць тутэйшае насельніцтва з надзвычайнай лёгкасцю. Адзінкі, якія спрабуюць змагацца за сваё жыццё, церпяць паразу. Дарэчы, характэрнай адзнакай экзістэнцыялізму з'яўляецца тое, што , ухваляючы кожны рашучы ўчынак з боку асобы, ён разам з тым сцвярджае дарэмнасць бунту ва ўмовах соцыуму, што і праілюстравана ў творы Ю.Станкевіча. Ад бяссілля і адчаю ўзнікае спроба пераасэнсаваць наступствы атамнай аварыі, якая на фоне суцэльнага беспрасвецця не ўяўляецца такой ужо і цёмнай плямінай: "…каб не той Чарнобыль, то нам ужо даўно б гамон быў; панаехалі б з усіх бакоў прыхадні, чужынцы ўсякія, і лепшыя землі адабралі б ды захапілі б – дзе хітрасцю, дзе падманам, а дзе і сілай, а так – каму з іх асабліва ахвота ў радыяцыю лезці, а хто лезе – тыя зусім ужо набрыдзь, смецце…" [3].

Падобная рацыяналізацыя – тлумачэнне неспрыяльнага на сваю карысць,- з аднаго боку, ёсць складнікам славутай талерантнасці, дзякуючы якой беларусы здольны наступаць на сваю годнасць, ратуючы тым самым сабе жыццё. Другі ж бок медаля – рахманасць, неразборлівасць і безыніцыятыўнасць, якія паступова і прыводзяць нацыю да скону: "Калі пацукі заводзяцца ў доме, то гэта дрэнная прыкмета – значыць туды неўзабаве бяда прыйдзе, а людзей, каб падпрэгчыся ды вам дапамагчы, няма, вы ж пахадзілі па хатах, пабачылі – юдава поле" [4].

Юдава поле…Бадай, гэтыя словы выступаюць лейтматывам мастацкіх твораў апошніх гадоў, пры чым не толькі чарнобыльскай тэматыкі. Сапраўды, Чарнобыль стаўся тым аб'ектыўным аспектам, што ўскладніў становішча Беларусі, але толькі ўскладніў. Часам здаецца, што калі б не гэтае гора, дык якое б іншае напаткала нашу зямлю, глеба якой узарана для падобных катастроф самімі беларусамі. Застаецца толькі меркаваць, калі ж гэты народ будзе сам засяваць свае палеткі, якія даўно ўжо чакаюць здаровага зерня, а не пота і крыві.

---

[1] Быкаў В. Ваўчыная яма // Полымя.1999.№1.С.41
[2] Тамсама.- С.46
[3] Станкевіч Ю. Любіць ноч – права пацукоў // Крыніца.1998.№9 (46). С.108
[4] Тамсама.- С.90

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ